**Дубянецкі Міхаіл Фёдаравіч ( 4 сакавіка 1927– 3 верасня 1990), перакладчыка, публіцыста, журналіста, грамадскага дзеяча**



Беларускі кнігавыдавец, перакладчык, публіцыст, грамадскі дзеяч. Брат Станіслава Федаравіча Дубянецкага, беларускага філосафа і палітолага. Нарадзіўся Міхаіл Фёдаравіч у вёсцы Востраў Пінскага павета Палескага ваяводства, цяпер Пінскага раёна Брэсцкай вобласці, ў шматдзетнай сялянскай сям'і, у якой панавала атмасфера чалавекалюбства і дабрыні, выхоўваліся працавітасць, любоў да роднай зямлі, да пазнання новага, нязведанага. Імкненне дзяцей да вучобы настойліва падтрымліваў бацька, Фёдар Ігнатавіч, чалавек па тым часе адукаваны, які некалі сам скончыў народную вучэльню. У свае няпоўныя сем год Міхась стаў вучнем сямігадовай польскай школы ў роднай вёсцы, а ў 1938 г. быў накіраваны на вучобу ў адну з гімназій у Познані. У 1939 г. папоўніў адукацыю ў Пінскім педагагічным вучылішчы (завочна). У сувязі з пачаткам II сусветнай вайны і далучэннем Заходняй Беларусі да БССР Міхась быў вымушаны спыніць навучанне і вярнуцца дамоў.

У 1944 г. скончыў кароткатэрміновыя настаўніцкія курсы ў Пінску. Працаваў настаўнікам пачатковых класаў Лемяшэвіцкай няпоўнай сярэдняй школы Пінскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі (1945-1951). Пасля дэмабілізацыі у 1951-1952 гг. працаваў прапагандыстам Пінскага райкома КПБ, у 1952-1956 гг. – слухач Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КПБ (скончыў яе ў 1956 г.).

Настаўнічаў, працаваў у прэсе, на партыйнай рабоце. У 1956-1957 гг. – загадчык аддзела Ганцавіцкага райкома КПБ. У 1958-1961 гг. – намеснік рэдактара ганцавіцкай раённай газеты “Сялянская праўда”. Адначасова з працай у газеце ў 1960 г. скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС па спецыяльнасці журналістыка.

Пасля пераезду ў Мінск (1961 г.) працаваў рэдактарам сацыяльна-палітычнай літаратуры ў выдавецтве “Беларусь”, з 1964 г. – загадчыкам рэдакцыі эканамічнай літаратуры, а з 1967 г. – галоўным рэдактарам выдавецтва “Ураджай”. У 1968—75 гадах у якасці інструктара сектара друку ЦК КПБ актыўна садзейнічаў удасканаленню і развіццю кнігавыдавецкай і энцыклапедычнай справы ў рэспубліцы, быў ініцыятарам стварэння і выпуску шматтомных выданняў беларускай нацыянальнай літаратуры і фальклору. У 1975—79 гадах працаваў адказным сакратаром - намеснікам галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. У 1979—86 гадах — дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура». На гэтых пасадах найбольш поўна раскрыўся ягоны талент арганізатара кнігавыдавецкай справы.

Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1984 г. У 1986 г. па стану здароўя выйшаў на пенсію, але працягваў прымаць самы актыўны ўдзел у грамадска-палітычным і культурным жыцці краіны. Быў старшынёй гісторыка-мемарыяльнай камісіі Беларускага фонду культуры, адным з заснавальнікаў гісторыка-асветнага таварыства памяці ахвяр сталінізму “Мартыралог Беларусі”, Беларускага народнага фронту “Адраджэнне”.

Роднае слова зачароўвала і вабіла М.Дубянецкага з маленства. Актыўную творчую дзейнасць ён пачаў у 1959 г. з публітыстыкі ў ганцавіцкай раённай газеце “Савецкае Палессе”. Але паводле ўласнага прызнання пісьменніка, ён “лепш знайшоў сябе як перакладчык мастацкай літаратуры”.

У штотыднёвіку “Літаратура і мастацтва” у 1964 г. дэбютаваў перакладам з польскай мовы апавядання Стэфана Жаромскага “Забыццё”. Перакладаў таксама з рускай і ўкраінскай моў. На беларускую мову пераклаў “Жыві і помні” В.Распуціна, “Клімко” Г.Цюцюнніка, “Гэта дзіўнае жыццё” Д.Граніна, “Блакадную кнігу” А.Адамовіча і Д.Граніна, “Верную раку” С.Жаромскага, зборнік украінскіх апавяданняў “Сцежка без канца”. У 1998-1999 гг. апублікавана яго дакументальна-публіцыстычная аповесць “Злое вогнішча”.

Перакладаў М.Дубянецкі толькі з моваў, якія добра ведаў, якімі валодаў свабодна, дасканала, таму яго пераклады вылучаліся высокім мастацкім густам, глыбокім і тонкім адчуваннем як роднага слова, так і духу арыгінала.

Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

## *ТВОРЫ:*

1. **Паміж** Бобрыкам і Ланню : Ганцаўшчына літаратурная : проза, паэзія, публітыстыка : [зборнік / укладанне В. Гардзея і К. Мохара]. – Мн. : Маст. літ., 2007. – 414 с. іл. – (Беларусь літаратурная : БЛ)

Сярод аўт.: Дубянецкі, Міхаіл Федаравіч (1927-1990)

2. **Дубянецкі, М.** Езуіт Сяўрук цкуе пісьменніка з сусветным імем. 1980 – 1982 **:** барацьба за "Мёртвым не баліць" / М. Дубянецкі // Шапран, С. Васіль Быкаў : Гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах, лістах. Частка 2 / С. Шафран. – Мінск-Гародня, 2009. – 774 с. : іл. – (Бібліятэка Бацькаўшчыны, Гарадзенская бібліятэка. Людзі Беларусі : кн. 2, ч. 2).

3. **Дубянецкі, М.** Злое вогнішча. Да гісторыі выдання аповесці Васіля Быкава «Мёртвым не баліць» / М. Дубянецкі // Полымя. 1999. № 2. С. 161-191; Народная Воля. 1998. 12 жніўня

4. **Дубянецкі, М.** “Трэба рызыкаваць”: Дзённікавыя запісы 1985-1988 гадоў / М.Дубянецкі ; уступ. слова С. Законнікава ; публікацыя М. М.

Дубянецкай ; апрац., падрыхтоўка да друку А. Урбана // Полымя. 2001. № 10-12 ; 2002. № 1-4

5. **Дубянецкі, М.** “Трэба рызыкаваць” : Дзённікавыя запісы 1985-1988 гадоў / М. Дубянецкі ; падрыхтоўка да друку С.Дубянецкага ; публікацыя М. М. Дубянецкай // Дзеяслоў. 2008. № 6 (37) ; 2009. № 1-6 (38-43) ; 2010. № 1-5 (44-48).

6. **Навечно в сердце** народном : [энциклопедический справочник о Героях Советского Союза и полных кавалерах ордена Славы — уроженцах Белоруссии и других стран] / [над книгой работали : И. Е. Афнагель и др. ; гл. ред. П. У. Бровка]. — 2-е изд., доп. и испр. — Минск : Главная редакция Белорусской Советской Энциклопедии, 1977. — 519, [1] с.

7. **Советская Белоруссия** = Bielorrusia Sovietica : [фотоальбом] / [текст М. Ф. Дубенецкого]. — Минск : Беларусь, 1977. — [31] с. — На русском и испанском языках.

8. **Советская Белоруссия** = Bielorussie Sovietique : [фотоальбом] / [текст М. Ф. Дубенецкого]. — Минск : Беларусь, 1977. — 30 [1] с. — На русском и французском языках.

9. **Советская Белоруссия** = Съветска Белорусия : [фотоальбом] / [текст М. Ф. Дубенецкого]. — Минск : Беларусь, 1976. — 23, [1] с. — На русском и болгарском языках.

10. **Советская Белоруссия** = Białoruś Radziecka : [фотоальбом] / [текст М. Ф. Дубенецкого ; фото В. А. Барановского и др.]. — Минск : Беларусь, 1976. — 23, [1] с. — На русском и польском языках.

11. **Советская Белоруссия** = Soviet Byelorussia : [фотоальбом] / [текст М. Ф. Дубенецкого]. —Минск : Беларусь, 1976. — 30, [1] с. — На русском и английском языках.

12. **Советская Белоруссия** = Bialorus Radziecka : [фотоальбом] / [текст М. Ф. Дубенецкого]. — Минск : Беларусь, 1975. — 30, [2] с. — На русском и польском языках.

13. **Савецкая Беларусь** = Советская Белоруссия : [фотаальбом] / [фота М. П. Ананьіна і інш. ; тэкст М. Ф. Дубянецкага]. — Мінск : Беларусь, 1975. — 30, [2] с. — На беларускай і рускай мовах.

14. **Советская Белоруссия** = Sowjetbelorussland : [фотоальбом] / [пер. П. Г. Швабович ; фото В. А. Барановского, И. И. Змитровича ; автор текста М. Ф. Дубенецкий]. — Минск : Беларусь, 1974. — 24 с. — На немецком языке.

15. **Савецкая Беларусь** = Советская Белоруссия : [фотаальбом] / [фота В. Бараноўскага, І. Змітровіча ; тэкст М. Ф. Дубянецкага]. — Мінск : Беларусь, 1973. — 32 с. : іл. — На беларускай і рускай мовах.

***ПЕРАКЛАДЫ:***

1. **Сцежка** без канца : апавяданні / пер. з укр. М.Дубянецкага. – Мн. : Маст. літ.,1980. – 351 с. : іл.
2. **Распуцін, В.** Жыві і помні : аповесць / В.Распуцін ; пер. з рус. мовы М. Дубянецкага. – Мн. : Маст. літ., 1982. – 235 с.
3. **Цюцюннік, Г.** Клімко : аповесць / Г.Цюцюнник ; пер. з укр. М. Дубянецкага. – Мн., 1982
4. **Адамовіч, А.** Дзённік Юры Рабінкіна : з «Блакаднай кнігі» / А. Адамовіч, Д. Гранін ; пер. з рус. М. Дубянецкага // Братэрства. Мн.,1983
5. **Гранін, Д.** Гэта дзіўнае жыццё : аповесці і апавяданні / Д.Гранин ; уклад. А. Адамовіч ; пер. з рус. М. Дубянецкага. – Мн. : Маст. літ., 1983. – 301 с.
6. **Цюцюннік, Г.** Небасхіл : апавяданне / Г.Цюцюннік ; пер. з укр. М. Дубянецкага // Ад круч дняпроўскіх. Мн.,1984
7. **Салаухін, У.** Барометр ; Рыбін бог : апавяданні / У. Салаухін ; пер. з рус. М.Дубянецкага // Салаухін У. Пад адным дахам. Мн., 1984
8. **Адамовіч, А.** Блакадная кніга / А. Адамовіч, Д. Гранін ; пер. з рус. М. Дубянецкага. – Мн. : Маст. літ., 1985. – 524 с.
9. **Жаромскі, С.** Верная рака : аповесць, апавяданні, абразкі / С.Жаромскі ; выбр. і пер. з польскай мовы М.Дубянецкі. – Мн. : Маст. літ.,1985. – 302 с., 10 л. : іл.
10. **Жукроўскі, В.** Лётна ; Уваскрэслы Лазар, альбо Радасць жыцця ; Прыяцель з Люлічанга : апавяданні / В. Жукроўскі ; пер. М. Дубянецкага // Далягляды, 1988 : Замеж. літ. / уклад. А.Гардзіцкі ; рэдкал. : А.Вярцінскі (гал. рэд.) і інш.
11. **Мрожак, С.** Эмігранты / С.Мрожак ; пер. М. Дубянецкага // Вар’ят і манашка. Польская драматургія XX ст. : зборнік / укл. С. Кавалёва ; пер. з польск. М. Дубянецкага, С. Кавалёва, Н. Русецкай ; Пасляслоўе Т. Конанавай. — Мінск : Логвінаў, 2006. — 212 с. — (Другі фронт мастацтваў).
12. **Жаромскі, С.** Забыццё : апавяданне / С.Жаромскі ; пер. з польск. М. Дубянецкага // Літаратура і Мастацтва. 1964. 13 кастр.
13. **Жаромскі, С.** Помста : апавяданне / С.Жаромскі ; пер. з польск. М. Дубянецкага // Ніва. 1964. 1 ліст.
14. **Суліма-Камінскі, К.** Капялюш з вуаллю : апавяданне / К. Суліма-Камінскі ; пер. з польск. М. Дубянецкага // Чырв. змена. 1964. 29 ліп.
15. **Суліма-Камінскі, К.** Помста : апавяданне / К.Суліма-Камінскі ; пер. з польск. М.Дубянецкага // Чырв. змена. 1964. 14 кастр.
16. **Жаромскі, С.** Змрок : апавяданне / С.Жаромскі ; пер. з польск. М. Дубянецкага // Чырв. змена. 1970. 15 верасня
17. **Шчэрбак, Ю.** Закон зберажэння дабра : апавяданне / Ю.

Шчэрбак ; пер. з укр. М. Дубянецкага // Беларусь. 1980. № 12

18. **Крыжаніўскі, А.** Крок да бяссмерця ; Культурны злодзей : гумарэскі / А.Крыжаніўскі ; пер. з укр. М. Дубянецкага // Вожык. 1980. № 23

19. **Кезля, У.** Завіруха : апавяданне / У.Кезля ; пер. з укр. М. Дубянецкага // Полымя. 1982. № 12

20. **Логвін, Ю.** Сярэбраная вуздэчка : апавяданне / Ю.Логвін ; пер. з укр. М. Дубянецкага // Полымя. 1982. № 12

21. **Цюцюннік, Г.** Небасхіл ; Праследак ; Грушы з крыніцы ; Людзям на дабро ; Арэлі : апавяданні / Г. Цюцюннік ; пер. з укр. М. Дубянецкага // Полымя. 1983. № 7

22. **Гранін, Д.** Да поезда заставалася тры гадзіны : апавяданне / Д. Гранін ; пер. з рус. М. Дубянецкага // Літаратура і Мастацтва. 1983. 14 студз.

23. **Вар’ят і манашка** : польская драматургія XX ст. : зборнік / Польскі інстытут у Мінску ; уклад. С. Кавалёва ; [пер. з польскай М. Дубянецкага, С. Кавалёва, Н. Русецкай ; пасляслоўе Т. Команавай]. — Мінск : І. П. Логвінаў, 2006. — 208, [1] с. — (Другі фронт мастацтваў).

## *РЭЦЭНЗІІ:*

1. **Дромін, Е.** Кнігапіс / Е.Дромін // Літаратура і Мастацтва. 1981. 5 чэрв. Рэц. на кн. : Сцежка без канца : апавяданні / пер. з укр. М. Дубянецкага. Мн. : Маст. літ., 1980.

2. **Тычына, М.** Патрэба літаратуры / М.Тычына // Полымя. 1982. № 12. Рэц. на кн : Распуцін, В. Жыві і помні : аповесць / пер. з рус. М. Дубянецкага. Мн. : Маст. літ., 1982.

## *БІБЛІЯГРАФІЯ:*

1. **Праневіч, Г.** Дубянецкі Міхаіл // Беларускія пісьменнікі : Біябібліяграфічны слоўнік. У 6 т. Т. 2. / Ін-т імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь Беларус. Энцыкл. ; пад рэд. А. В. Мальдзіса ; рэдкал. : І. Э. Багдановіч і інш. – Мн. : БелЭн,1993. – С. 391-392. Дата нараджэння 4.**04.**1927 г.

2. **Міхаіл** Дубянецкі // Беларускія пісьменнікі : даведнік / склад. А. К. Гардзіцкі ; нав. рэд. А. Л. Верабей. – Мн. : Маст. літ.,1994. – С. 189 – 190. Дата нараджэння 4.**03.**1927 г.

3. **Саламевіч, І.** Дубянецкі Міхаіл Фёдаравіч // Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 6. – Мн. : БелЭн,1998. – С. 250. Дата нараджэння 4.**03.**1927 г.

4. **Міхаіл** Дубянецкі : біяграфічныя звесткі / Піншчына літаратурная : літ.-маст. зб./ рэдкал. : М. І. Ляшук (гал. рэд.) і інш. ; прадм. В. І. Локун ; уступ. арт. І. Д. Чараўко. – Пінск : Рэд. газеты “Пінскі веснік”,1999. – С.97-98. Дата нараджэння 4.**03.**1927 г.

5. **Дубянецкі** Міхаіл Фёдаравіч // Памяць : гіст.-дакум.хроніка Ганцавіцкага раёна. – Мн. : БЕЛТА, 1999. – С.414-415. Дата нараджэння 4.**03.**1927 г.

6. **Дубянецкі** Міхаіл Фёдаравіч // Памяць : гіст.-дакум.хроніка Пінскага раёна. – Мн. : БЕЛТА, 2003. – С. 489-491. Дата нараджэння 4.**03.**1927 г.

7. **Дубянецкі, С.** Дубянецкі М. // Конкамфармізм у Беларусі. 1953-1985 : даведнік. Т. 1. – Мн., 2004. – с. 76-79

8. **Міхаіл** Дубянецкі (1927-1990) // Літаратурная карта Берасцейшчыны / укл. А. Крэйдзіч. – Брэст : ААТ “Брэсцкая друкарня”, 2008. – С. 470. Дата нараджэння 4.**03.**1927 г.

Тэлефанавалі ў г. Мінск брату М. Дубянецкага Станіславу Фёдаравічу Дубянецкаму, у якога высветлілі дату нараджэння пісьменніка – **4.03.1927 г.**

9. **Марціновіч, А.** «Мастацкая літаратура» : набыткі, планы / А. Марціновіч // Літаратура і Мастацтва. 1981. 20 лютага

10. **Марціновіч, А.** Прыняты ў СП БССР // Літаратура і Мастацтва. 1984. 14 снеж.

11. **Хомчанка, В.** Гісторыя адной тэлеграмы / В. Хомчанка // Літаратура і Мастацтва, 1990. 11 мая

12. **Быкаў, В.** З высакароднага саслоўя / В. Быкаў // Літаратура і Мастацтва. 1997. 7 сакав.

13. **Дранько-Майсюк, Л.** Дубянецкі / Л.Дранько-Майсюк // Літаратура і Мастацтва. 1997. 7 сакав. ; 2000. 1 верас.

14. **Паршуціч, Я.** След у жыцці / Я. Паршуціч // Полесская правда. 1997. 2 апр.

15. **Законнікаў, С.** Прадмова да нататак М.Дубянецкага «Злое вогнішча / С. Законнікаў // Полымя. 1999. № 2. С. 160-161

16. **Палескі, С.** Выдавец, перакладчык і грамадскі дзеяч // Літаратура і Мастацтва. 2000. 1 верас.

17. **Зычлівы, Я.** 75 гадоў Міхаілу Дубянецкаму / Я. Зычлівы // Наша слова. 2002. 20 сакав.

18. **Саламевіч, Я.** Адданы сын народа : згадкі пра Міхаіла Дубянецкага / Янка Саламевіч // Роднае сл. 2002. № 4. С.104-105

19. **Ён** жыў для Беларусі : да 80-годдзя з дня нараджэння вядомага кнігавыдаўца і перакладчыка, аднаго з пачынальнікаў нацыянальна-адраджэнскага руху ў Беларусі канца 1980-х – пачатку 1990-х гадоў Міхала

Дубянецкага ; публ. С. Ф. Дубянецкага і М. М. Дубянецкай // Нар. воля. 2007. 1 сакавіка

20. **Дубянецкі** Міхась / Архіў Саюзу пісьменнікаў БССР. Асабовая справа М. Дубянецкага // Электронная энцыклапедыя. http://www.slounik.org/81405.html

21. **Putrament M.** U białoruskich pisarży // Przyjaźc. 1980. Nr. 34

22. **Zinowiec M.** «A to echo grało»: Korespondencja wiasna z Mińska // Przyjaźc. 1984. Nr. 16.

## *ТВОРЫ, ПРЫСВЕЧАНЫЯ М.ДУБЯНЕЦКАМУ:*

1. **Бородулин, Р.** Азбука земли : М. Ф. Дубенецкому : [Верш] / Р. Бородулин ; пер. В. Тарас // Гимн книге. Мн., 1980.

2. **Барадулін, Р.** Кнігары : М. Ф. Дубянецкаму : [Верш] // Барадулін Р. Выбранныя творы : У 2 т. Т. 2. Мн., 1984.